*Н.У. САМЕРСАВА*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЭКАЛАГІЧНАГА НАПРАМКУ

У цяперашні час многія вучоныя-педагогі, псіхолагі, сацыёлагі, культуролагі, а таксама грамадскія дзеячы не без падстаў значную ўвагу надаюць пытанням тэорыі і практыкі сацыякультурнай і сацыяльна-педагагічнай работы. Зыходзячы з азначэння сацыякультурнай дзейнасці як сацыяльна арыентаванай дзейнасці па выяўленні, захаванні, распаўсюджванні, асваенні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, назапашаных пэўным грамадствам, этнасам, асобай, прасочым, як у традыцыях беларускага народа сцвярджаліся прынцыпы экалагічна разумных і мэтазгодных паводзін.

Складанасць сучаснай экалагічнай сітуацыі выклікае неабходнасць вярнуцца да гістарычнага вопыту продкаў, які зафіксаваны ў абрадах, звычаях, рытуалах, у беларускіх народных песнях, танцах, казках і легендах, якія раскрываюць характар узаемаадносін паміж чалавекам-земляробам і акружаючым яго прыродным асяроддзем. Сістэма пераемнасці традыцый дазваляе гарманізаваць адносіны чалавека да наваколля, дапамагае навучыцца ўспрымаць цэласную карціну свету.

“Адносіны паміж Чалавекам, Прыродай і Космасам мелі і цяпер маюць усебаковы характар, аднак яны не заўсёды былі падуладны нашаму разуменню. Магчыма, яны незразумелыя нам, сучаснікам дваццатага стагоддзя, людзям, якія паверылі ў невычарпальнасць зямнога багацця і якія падарвалі яго нерацыянальным гаспадараннем. А магчыма, у пагоні за рэкордамі навукова-тэхнічнага прагрэсу страцілі адчуванне рэальнасці, а разам з ім і зыходны код нармальных, узаемна ўраўнаважаных адносін з прыродай,” – адзначае беларускі вучоны-этнограф Янка Крук [1, с. 4].

У аснове фарміравання экалагічнай культуры любога народа ляжыць працэс яго натуральна-гістарычнага ўзаемадзеяння з прыродай, што адлюстроўваецца ў рэлігіі народа, яго тапаніміцы, народных традыцыях, абрадах і інш. Эколага-выхаваўчае значэнне культурнай спадчыны вызначаецца яе сучаснай роляй у гарманізацыі асобы, яе духоўным развіцці. Беларусы, як і іншыя славянскія народы, з даўніх часоў былі земляробамі. Асаблівасці гаспадарчай дзейнасці прадвызначылі асновы фарміравання народнага светапогляду, у цэнтры якога была гарманічная сувязь рэалій зямнога існавання з прыродна-касмічнымі працэсамі.

Вялікае значэнне для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, любові да роднай зямлі, яе прыродных каштоўнасцей мае вылучэнне двух узроўняў адлюстравання рэчаіснасці ў грамадскай свядомасці: эмацыянальнага і рацыянальнага. У адпаведнасці з першым узроўнем адлюстраванне рэчаіснасці адбываецца з улікам настрою, эмацыянальнай ацэнкі з’яў наваколля. У адпаведнасці з другім рэчаіснасць адлюстроўваецца ў форме навуковых і паўсядзённых паняццяў і ідэй. Названыя ўзроўні прадугледжваюць выкарыстанне нацыянальнага кампанента ў экалагічным выхаванні і адукацыі і маюць на мэце ўздзеянне на свядомасць, паводзіны і пачуццёвы свет асобы. Пачуццё дапамагае засваенню духоўна-маральных ідэй, якія закладзены ў нацыянальнай гісторыі і культуры, узмацняе іх ролю ў жыцці і дзейнасці чалавека.

Эмацыянальна насычаная дзейнасць паскарае фарміраванне пачуцця гонару за сваю родную зямлю, свой народ, вызначае нацыянальную годнасць асобы. На аснове ўсведамлення асобай нацыянальна-культурных і прыродных каштоўнасцей фарміруецца ўсведамленне ўласных патрэбнасцей. І, наадварот, засваенне маральна-этычных нормаў паводзін у прыродзе пераўтвараецца ў нейтральны працэс, які не аказвае ўплыву на фарміраванне асобы, калі не ўдаецца выклікаць у яе эмацыянальны водгук. Перакананнямі становяцца толькі тыя веды, якія глыбока кранаюць інтарэсы чалавека (у тым ліку і нацыянальныя) і якія звязаны з яго перажываннямі. Па гэтай прычыне вялікае значэнне для выхавання набывае выбар кампанентаў нацыянальнай культуры, якія адпавядаюць узроставым і псіхалагічным асаблівасцям чалавека.

На экалагічную свядомасць і звязаныя з гэтым маральныя і інтэлектуальныя пачуцці аказваюць вялікі ўплыў народныя казкі, быліны, песні, гульні, мастацкія промыслы, звычаі і абрады. Яны адлюстроўваюць нацыянальны ідэал, могуць быць выкарыстаны для арганізацыі разнастайных відаў дзейнасці, якія, у сваю чаргу, нярэдка ператвараюцца ў асобасна значныя для чалавека.

Праз народныя традыцыі адбываецца перадача маладому пакаленню пэўных духоўных якасцей, так неабходных для рэалізацыі маральных адносін. Маральныя прадпісанні рэгулююць адносіны чалавека да дрэў і кветак, птушак і жывёл, вучаць быць чулымі і гуманнымі. Экалагічныя ўяўленні славян-язычнікаў, абагаўленне імі прыроды з’яўляюцца своеасаблівай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інфармацыйнай сістэмай і асновай прыродакарыстання, якая абумоўлівае адзінства асноватворных каштоўнасцей: род, народ, ураджай, прырода, Радзіма (звяртаем увагу на агульны корань гэтых слоў).

Беларусы, чыім асноўным заняткам на працягу многіх стагоддзяў было земляробства, назапасілі багаты вопыт працоўнай дзейнасці і жыццёвага ўкладу, сутнасць якога складалі клапатлівыя адносіны чалавека да роднай зямлі. Аграрны народны каляндар увасобіў выпрабаваны практычны вопыт шматлікіх пакаленняў. На працягу соцень, тысяч гадоў чалавек ствараў непаўторную вусную энцыклапедыю жыцця – багатую паэтычную спадчыну і складаную сістэму абрадаў. З аднаго боку, у іх строга рэгламентуюцца ўзаемаадносіны з наваколлем, а з другога, абапіраючыся на заўважаную цыклічнасць, рытмічнасць, паўтаральнасць прыродных з'яў, народ можа, адзначаючы яўную сувязь паміж імі, прадказваць будучы ўраджай, паляпшэнне сямейнага дабрабыту і ўтрымання жывёлы, вылечванне ад хвароб і інш.

"Натуралістычныя назіранні за сезоннымі зменамі – абуджэннем веснавой флоры, цвіценнем і плоданашэннем раслін, прылётам і адлётам розных птушак, паводзінамі жывёл і насякомых, фазамі месяца, станам надвор'я ў пэўныя дні і іншага, што ўвязвалася ў адзіным рытме прыроднага і чалавечага быцця, – злучаліся ў ланцужкі прычынных узаемасувязей і ўтрымлівалі мноства карысных парад і прагнозаў, неабходных у паўсядзённай жыццядзейнасці", – зазначае В.С.Цітоў [2, с. 122].

У сваёй дзейнасці нашы продкі часта звярталіся ў думках да неба (культ Сонца, яго праслаўленне і пакланенне яму) і адначасова імкнуліся заручыцца падтрымкай свайго роду, сваіх продкаў (культ продкаў, захаванне памяці аб іх). Гэта адлюстроўвае вертыкальны зрэз духоўнай спадчыны. Па гарызанталі мы бачым прыроду ва ўсемагчымых праявах, галоўнымі з якіх з'яўляюцца вада і расліны.

Беларускі селянін ведае: калі зіма снежная, ураджай будзе добрым; народная прымаўка трапна сведчыць: "Як тры дажджы ў маю, дык мужык у раю". Каб быць здаровым на працягу года, неабходна ў "чысты чацвер" абавязкова да заходу сонца памыцца ў бані ці ў палонцы; усе ведалі, што ад першага купання дзіцяці залежаў увесь яго далейшы лёс.

Тое ж тычылася і раслін: хто не кладзе сена пад абрус, накрываючы стол перад калядамі, не можа разлічваць на нябеднае існаванне; каб карова ў статку хадзіла спакойна і давала многа малака, неабходна выгнаць яе ў першы раз асвечанай у царкве вербнай галінкай. На Сёмуху ў Беларусі прынята прыбіраць хату галінкамі клёна, ліпы ці бярозы, пры гэтым прадказваючы, якім будзе лета – сухім ці дажджлівым [1].

Вось толькі некаторыя прыклады са скарбніцы народнай мудрасці, у якіх сканцэнтраваны назіранні за прыродай і якія перадаваліся на працягу стагод- дзяў ад дзядоў унукам, ад бабуль унучкам: "Колас добра не спее, калі сонца не грэе", "Калі на лёд грыміць, то будзе вясна зімна", "Багата снегу – багата хлеба", "У красавіку грымоты – хлебны будзе год" і інш.

Пазнаючы тайны прыроды, вывучаючы прыметы, якія вызначаюць прыродныя заканамернасці, мы мудрэем, духоўна ўзбагачаемся, набываем вопыт сапраўды народных ашчадна-трапяткіх адносін да прыроды. Яшчэ раз звернемся да працы Янкі Крука, дзе ён піша: "Чалавек з'явіўся на гэты свет, сфарміраваўся як найвышэйшая арганізаванасць, цвёрда стаў на ногі і шырока расправіў плечы менавіта ва ўлонні Маці–Прыроды, таму ён ніколі не спрабаваў вылучыць сябе, узвысіцца над светам жывёл і птушак, расліннасці і дрэў. Наадварот, усё наваколле ўяўлялася яму жывым, адухоўленым да разумных і абачлівых паводзін" [1, с. 3].

Да нашых дзён у жывой маўленчай стыхіі народа захаваліся рэшткі старадаўняга антрапамарфізму. Як аб жывых істотах, гавораць: дождж ідзе, гром грыміць, сонца ўстае, месяц старэе, вецер шуміць і інш.

З асаблівай павагай чалавек ставіцца да сонца: яно дае жыццё ўсяму жывому на зямлі. Шмат часу прайшло, пакуль чалавек зразумеў, што жыццё самога сонца мае пэўную цыклічнасць. У непасрэднай залежнасці ад сонечных цыклаў ідзе і жыццё на зямлі.

Гэтую прыродную ўзаемазалежнасць захавалі шматлікія прыказкі і прымаўкі, загадкі і песні: "Сонца ўстане, так і дзень настане","Усякаму чалавеку сонца свеціць". Памяць людзей захавала бясконцую колькасць загадак, у якіх з вялікім мастацкім густам апаэтызавана галоўнае нябеснае свяціла: "Кругленька, бяленька, усяму свету міленька", "Усе яго любяць, чакаюць, а глянуць, убачаць – адразу заплачуць", "Свеціць і грэе, весяліць і ззяе, усю зямлю ажыўляе", "Мяту, мяту – не вымету, нашу, нашу – не вынашу, як пара прыйдзе – само выйдзе".

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

У беларускай народнай міфалогіі існуе функцыянальны падзел паміж рознымі дрэвамі. Царом леса звычайна называюць дуб. У многіх загадках сонца жыве менавіта на вершаліне дуба: “Стаіць дуб-старадуб, на тым дубе-старадубе сядзіць пцічка-варанічка, ніхто яе не спаймае: ні цар, ні царыца, ні красная дзявіца”.

Асабліва любіма беларусамі Купалле – адно з самых яркіх і паэтычных свят, багатае сваімі абрадамі, легендамі і прытчамі. Адна з такіх легенд звязана з кветкай папараці, якая расцвітае ў купальскую ноч. Таму, хто знойдзе гэтую кветку, будуць падуладныя ўсе скарбы, зразумелая мова дрэў, траў, птушак, звяроў. Вельмі паэтычная прытча пра тое, што ў купальскую ноч рэкі свецяцца незвычайным святлом, а дрэвы і травы надзяляюцца ўменнем гаварыць.

Важнейшым культам купальскага свята з’яўляецца культ сонца, з якім звязваюць будучы ўраджай, багацце траў і раслін, прыплод жывёлы, шчаслівае жыццё людзей. Сімвалам сонца з’яўляецца агонь (вогнішча), які мае ачышчальнае, захавальнае, лекавае значэнне. Вось чаму такімі важнымі ў купальскім абрадзе з’яўляюцца вогнішчы. Ачышчальная і лекавая роля агню выяўляецца і ў спальванні старых рэчаў, адзення хворых людзей. Рытуальным было спальванне “мая” – засохлай зелені, якой упрыгожвалі хаты на Сёмуху. Дымам ад “мая” і спецыяльна спаленых лекавых раслін акурвалі дзяцей, хворых, вакол вогнішча абводзілі жывёл. З абрадаў аграрнай магіі вядомы выпадкі, калі старыя людзі кідалі ў вогнішча розныя прадметы, прыгаворчаючы: “Радзі, жыта”, “Расці, лён”, “Радзіся, скацінка”.

Побач з культам сонца ў купальскіх абрадаў вельмі значны культ вады. У беларусаў вада карыстаецца асаблівай увагай. На Купалле хлопцы і дзяўчаты спраўляюць рытуальнае купанне ў рацэ, возеры, вадаёме, бо ў гэтую ноч вада валодае лекавай і пладаноснай сілай. Яна, па паданні, робіць людзей прыгожымі і здаровымі. Аналагічны сэнс маюць ўмыванне ранішняй купальскай расой і качанне па расе ў жыце. Перад наступленнем купальскай ночы дзяўчаты і жанчыны адпраўляюцца на луг, у поле, у лес збіраць купальскія зёлкі, якія ў гэты час маюць асаблівую лекавую моц. Дзяўчаты збіралі таксама і рытуальныя кветкі для вянкоў, на якіх варажылі, пускаючы іх па рацэ.

Найбольш складаным, функцыянальна шматпланавым з’яўляецца вясновы цыкл народных свят. Яго галоўнай ідэяй была ідэя адраджэння і аднаўлення прыроды ў яе адвечным кругавароце жыцця і смерці. Вясной пачыналася самая адказная праца: узворванне, сяўба, выган скаціны на пашу. Ад таго, як своечасова і правільна будзе выканана гэтая праца, залежаў будучы дабрабыт чалавека. Беларуская прыказка такім чынам адлюстроўвала гэтую прыродную адпаведнасць: “Восень кажа –я ўраджу, вясна кажа – пачакай, як дагаджу”.

Адзначаныя важныя вехі ў працоўнай дзейнасці селяніна адлюстроўваліся адпаведна ў звычаях і абрадах. Канец зімы і пачатак вясны ва ўяўленні сялян быў даволі своеасаблівым перыядам. Сонца ўзнімалася ўсё вышэй і вышэй над гарызонтам, станавілася больш ласкавым і цёплым, хутка павялічваўся дзень. Ажывала прырода: дрэвы поўніліся новым сокам зямлі (адсюль беларуская назва месяца сакавік), прыляталі з поўдня птушкі. Абуджэнне прыроды пасля доўгай зімы ўяўлялася чалавеку яго уласным абнаўленнем. Чалавек як арганічная частка прыроды імкнуўся ачысціць сваю душу, падрыхтаваць арганізм да пераходу на новую ежу. Менавіта таму на гэты перыяд выпадаў самы працяглы, сямітыднёвы (ад Масленіцы да Вялікадня) Вялікі пост. Нібы просячы прабачэнння ва ўсяго жывога, селянін не толькі не забіваў у пост ніякае жывёлы, але і, гатуючы ежу, абыходзіўся без тлушчу і мяса жывёл.

Вялікі пост супадаў па часе з тым складаным перыядам, калі чалавечы арганізм адчуваў недахоп вітамінаў і мікраэлементаў. Каб падтрымаць актыўнасць фізіялагічных працэсаў і пераадолець натуральны авітаміноз, беларускія сяляне гатавалі шэраг посных страў. Сярод іх былі пірагі з тушанай капустай, грыбамі, вараная бульба з салёнымі гуркамі, вараны гарох, фасоля, прэсная грэцкая і аўсяная кашы, рэдзька з алеем, кісялі з брусніц, журавін і чарніц і інш.

Як бачым, абрады і звычаі беларусаў мелі глыбокі гуманістычны змест і заўсёды былі звязаны з прыродай. Пералік прыкладаў беларускай народнай абраднасці вялікі і разнастайны. Пакланенне перад сілай, прыгажосцю і мудрасцю прыроды прасякае такія беларускія абрады, як “Троіцка-сяліцкі”, “Каравайны”, “Валачобны”, “Юр’еўскі”, “Пакосны”, “Жніўны” і шэраг іншых. Абрады і песні, якія арганічна ўваходзяць у іх, маюць вялікія магчымасці для глыбокага эмацыянальнага ўплыву на ўнутраны свет падрастаючага пакалення, служаць неаспрэчным сродкам выхавання любові да роднай зямлі. “Толькі песня можа ў поўнай меры раскрыць прыгажосць зямлі, на якой жывеш, перадаць багацце душы народа, яго ўсхваляванасць за далейшы лёс роднай маці-прыроды. Мелодыя і словы народнай песні – гэта магутная выхаваўчая сіла, якая мае магчымасць паказаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзіцяці ў даступнай для яго форме народныя ідэалы і імкненні”, – гаварыў славуты беларускі паэт Ніл Гілевіч, выступаючы перад навучэнцамі адной з мінскіх школ.

Яркім прыкладам любові да роднай прыроды, яе непаўторнасці і прыгажосці могуць служыць такія вядомыя беларускія народныя песні, як “Журавель”, “Ляцелі гуселкі”, “Ой, вясна, ой, вясна”, “Медуніца лугавая”, “Пасеялі дзеўкі лён”, “Бусел”, “Белабока-сарока”, “А мы грушу пасадзілі”, “Божая кароўка”, “Гуканне вясны” і інш.

Данесці да свядомасці дзіцяці неабходную маральную ідэю дазваляе казка. Яркія вобразы герояў беларускіх казак не пакідаюць раўнадушным ні розум, ні сэрца, дапамагаюць чалавеку перажываць гора і радасць, выклікаюць любоў да дабрыні і нянавісці да зла. Такія народныя казкі, як “Лёгкі хлеб”, “Як пеўнік курачку ратаваў”, “Сын леса”, “Дзіва”, “Два зайцы”, “Шчасце і гора” і іншыя, спрыяюць абуджэнню маральных перажыванняў на эмацыянальна-вобразнай аснове, з’яўляюцца важным сродкам фарміравання маральнага ідэалу.

Разыгрыванне сцэнак на аснове казак, апавяданняў, баек, у якіх дзейнічаюць розныя персанажы жывёл і раслін, з’яўляецца адным з прыёмаў, што ўзмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне наваколля. Менавіта таму сёння вялікую папулярнасць набылі экалагічныя тэатры.

У фарміраванні пачуцця адказнасці за прыроду роднай зямлі вялікае значэнне мае краязнаўчая работа, якая з’яўляецца адным з важнейшых сродкаў экалагічнай адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення, росту яго нацыянальнай самасвядомасці. Краязнаўчая дзейнасць мае рэальныя магчымасці індывідуалізацыі працэсу фарміравання экалагічнай свядомасці, з’яўляючыся адным з важнейшых сродкаў сувязі выхавання і прыроды. Прынцып краязнаўчага падыходу спрыяе фарміраванню практычных уменняў і навыкаў паводзін у прыродзе, дапамагае асвойваць маральна-этычныя нормы адносін да навакольнага асяроддзя, дазваляе закранаць глыбінныя пласты народнай мудрасці, выхоўваючы чалавека на высокіх маральных традыцыях народа Беларусі.

---

*1. Крук І.* Следам за сонцам: беларускі народны каляндар: святы, абрады, паэзія /Ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. – Мн., 1994. – 200 с.

*2. Титов В.С.* Этнография и экология (традиционное земледелие: народные знания, обычаи, обряды) // Экопедагогика: состояние, проблемы, перспективы: Тез. докл. – Мн., 1995. – С. 122–124.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ